**А.М. Муравіцкая**

# ДУХОЎНАЯ СПАДЧЫНА СВЯТЫХ І ПАДЗВІЖНІКАЎ БЕЛАРУСКАЙ ЗЯМЛІ

## ДУХОВНОЕ НАСЛЕДИЕ СВЯТЫХ И ПОДВИЖНИКОВ БЕЛОРУССКОЙ ЗЕМЛИ
## SPIRITUAL HERITAGE OF SAINTS AND MOBILS OF THE BELARUSIAN EARTH

Отмечается специфический характер белорусской святости, которая в значительной степени отражает и характер народа. Аскетизм у белорусских святых соединялся с общественным служением, духовной просветительской деятельностью.

Ключевые слова: белорусские святые; святость; христианская вера; преподобные; мученики; духовное просвещение; праведность.

The specific character of Belarusian holiness is noted, which largely reflects the character of the people. Asceticism among the Belarusian saints was connected with public service, spiritual enlightenment activity.

Keywords: Belarusian saints; holiness; Christian faith; the Reverend; martyrs; spiritual enlightenment; righteousness.

БГУ, Минск, Беларусь.

Гісторыя народу найбольш ярка ўвасоблена ў духоўных вобліках, справах і творчых плёнах яго лепшых сыноў і дачок. Мы не толькі павінны, але і абавязаны ведаць сваё мінулае, каб лепш убачыць сваё заўтра, каб ясней уяўляць, як да яго ісці. На працягу тысячагадовай гісторыі Праваслаўнай Царквы ў Беларусі ў розныя часы праславіліся сваім жыццём угоднікі Божыя, якія сталі дастойнымі ўдзельнікамі Яго нябеснай славы.

Неабходна адзначыць спецыфічны характар беларускай святасці, якая ў значнай ступені адлюстроўвае і характар народу. Незалежна ад таго, ці размова ідзе пра князёў, свяціцеляў, мучанікаў або прападобных, іх святасць была, як правіла, дзейная, накіраваная на грамадскае, агульнае дабро. Аскетніцтва, якое прынцыпова паклікана для ізаляванага, асабістага збаўлення, у беларускіх святых спалучалася з грамадскім служэннем. Яны не абмяжоўваліся закрыццём у манастырскіх келлях, але ахвотна неслі ў народ святло сваіх ведаў, сваю высокую мараль і ўласны прыклад праведнага жыцця. Дзякуючы гэтаму беларускія святыя былі сапраўднымі светачамі, соллю зямлі беларускай, яе святлом, розумам, гонарам і сумленнем [1, с. 55–56].

Самымі старажытнымі ў Беларусі з’яўляюцца Полацкая і Тураўская епархіі, таму і першымі вядомымі нам беларускімі святымі былі святыя Полацкія і Тураўскія. Сярод іх **свяціцелі Міна, Дзіянісій і Сімяон**, епіскапы Полацкія, **свяціцелі Кірыл і Лаўрэнцій**, епіскапы Тураўскія. Гэта

першыя архіпастыры, якія сваім жыццём і служэннем спрыялі дабрадатнаму распаўсюджванню хрысціянскай веры ў першыя стагоддзі пасля Хрышчэння беларускай зямлі. У гэты ж перыяд свой манашаскі подзвіг здзяйснялі **прападобныя Марцін Тураўскі, Еўфрасіння Полацкая, Елісей Лаўрышаўскі**. Калі галоўнай свяцільскай мэтай заўсёды з'яўляецца ўсталяванне і ўмацаванне Царквы Хрыстовай, то насельнікі манастыроў, апрача асаблівага малітоўнага подзвігу, неслі абавязак духоўнага асветніцтва. Таму мы і называем прападобную Еўфрасінню духоўнай асветніцай беларускага народа.

У XII стагоддзі існавала яшчэ адна старажытная епархія, у склад якой уваходзілі беларускія землі, – Смаленская. Тут праславіўся сваімі богаўгоднымі справамі і праведнасцю **дабраверны Расціслаў**, князь Кіеўскі і Смаленскі. Ім былі пабудаваны мноства храмаў і манастыроў на нашых землях, сваім жыццём ён яўляў асабісты прыклад набожнасці і дабрадзейнасці.

У XIII–XIV стагоддзях хрысціянская вера распаўсюджвалася на паўночна-заходніх землях Вялікага княства Літоўскага. У той час здзейснілі свій мучаніцкі подзвіг **святыя Антоній, Іаан і Яўстафій Віленскія.** Іх мы ўшаноўваем як першых на Беларусі мучанікаў за Хрыста. І, відаць, не выпадкова пасля іх вызнаўчага подзвігу на землях Вялікага княства Літоўскага ўсталяваўся амаль 200-гадовы перыяд умацавання Праваслаўнай Царквы і росквіту асветы і адукацыі. У гэты перыяд Гасподзь праславіў **праведную дзеву Юліянію Альшанскую**, пра зямное жыццё якой амаль не захавалася звестак, і гэта таксама не выпадкова. Таму што ў яе вобліку мы бачым вобраз многіх беларускіх жанчын-хрысціянак, якія праведна і набожна здзяйснялі і зараз здзяйсняюць свой хрысціянскі подзвіг.

Цяжкім выпрабаваннем для Праваслаўя стаў перыяд уніі. Стойкасцю і адданасцю веры праваслаўнай у гэты час праславіліся **прападобнамучанікі Афанасій Брэсцкі і Макарый Пінскі, праведная Сафія Слуцкая, прападобны Ляонцій Віленскі.** Як нябеснага апекуна дзяцей мы ўшаноўваем **мучаніка дзіцятку Гаўрыіла Беластоцкага**. У перыяд уніі на тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага, якое ўваходзіла ў склад Рэчы Паспалітай, засталася толькі адна праваслаўная епархія з цэнтрам у Магілёве. На чале гэтай епархіі стаяў **свяціцель Георгій (Каніскі)**. Ён рашуча адстойваў правы праваслаўных вернікаў, арганізаваў шырокую асветніцкую дзейнасць, клапаціўся пра духоўны і адукацыйны ўзровень свяшчэннаслужыцеляў і народа. Сваёй падзвіжніцкай дзейнасцю архіепіскап Георгій падрыхтаваў дабрадатную глебу для вяртання духавенства з уніі ў Праваслаўе.

У гісторыі хрысціянскай царквы мірныя і стваральныя перыяды чаргуюцца з перыядамі выпрабаванняў і ганенняў. Адпаведна з гэтым у мірныя часы найбольш праяўляецца подзвіг праведнасці і дабрадзейнасці, а ў часы ганенняў здзяйсняюцца подзвігі мучаніцтва. Так, са спачынам у 1917 годзе **праведнага Іаана Кармянскага** звязваецца заканчэнне мірных часоў у гісторыі Царквы ў Беларусі. Пасля гэтага пачынаецца перыяд ліхалеццяў, калі мучаніцтва дзеля Хрыста прынялі тысячы людзей. Навамучанікі зямлі Беларускай яўляюць нам узор стойкага і бескампраміснага служэння на «ніве Хрыстовай» ва ўмовах масавых праследаванняў за веру праваслаўную. Абставіны арышту і смерці свяшчэннамучанікаў сведчаць, што ўсе яны сустрэлі пакуты з сапраўднай хрысціянскай пакорай і мужнасцю. Сярод праслаўленых Царквою ў гэты перыяд – навамучанікі **прасвітары Аляксій Лельчыцкі, Канстанцін Шаркаўшчынскі, Кіпрыян Ятранскі** і іншыя.

У 2006 годзе мы сталі сведкамі праслаўлення ў ліку святых угодніцы Божай **блажэннай Валянціны Мінскай**, якая ў цяжкія для Царквы часы несла свой духоўны малітоўны подзвіг. А ў 2007 годзе Царква праславіла прападобную **Манефу Гомельскую**, жыццёвы шлях якой таксама прыпаў на часы панавання атэізму [2, с. 5–10].

Для кожнага з беларускіх святых устаноўлены дзень памяці, акрамя таго, у трэцюю нядзелю пасля Пяцідзесятніцы (Троіцы) адзначаецца святкаванне Сабору Беларускіх святых. Хочацца ўспомніць словы архіепіскапа Гродзенскага і Ваўкавыскага Арцемія (Кішчанкі), які падчас святкавання Сабору Беларускіх святых у сваёй пропаведзі адзначыў: «Свята ў гонар беларускіх святых – гэта не проста пералічэнне нейкіх дзіўных людзей, якія жылі на нашай зямлі ў старажытныя часы і не мелі ніякага дачынення да рэальнага жыцця, гэта сцвярджэнне менавіта душы, духоўнага стрыжню беларускага народа, яго гісторыі, яго самавызначэння і светаўспрымання. Гэта сцвярджэнне таго, што кожны народ мае душу – гэта значыць, усё тое самае высокае, чыстае і лепшае, адносна чаго ён сябе вызначае. Гэта самае высокае, чыстае і лепшае, што ёсць у беларускім народзе, увасабляюць яго святыя. Дзень усіх беларускіх святых перарастае сваё ўласна царкоўнае і богаслужбовае значэнне. Ён становіцца пытаннем аб душы, аб сэнсе жыцця, аб сапраўдных каштоўнасцях нашага народа» [1, с. 56].

Для нас, нашчадкаў, святыя пакінулі ў спадчыну свой духоўны вопыт, шлях служэння, павучанні, рукапісы, кнігі. Праз малітоўныя звароты да святых і іх заступніцтва Гасподзь паказвае народу шлях да пакаяння і збаўлення.

**Літаратура**


1. Арцемій (Кішчанка), епіскап Гродзенскі і Ваўкавыскі. Пропаведзі. Жыровічы, 2012.
2. Святыя зямлі Беларускай: Жыццеапісанні / уклад. Л. Я. Кулажанка, Т. А. Матрунчык. Мінск, 2012.